# ТЭНДЭНЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў ВЫВУЧЭННІ ДЗЕЙНАСЦІ ВОТЧЫННЫХ МАНУФАКТУР НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Я. У. Макоўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск, Беларусь, MakouskayaYV@bsu.by*

XXI стагоддзе прынясло значныя навацыі ў вывучэнне праблемы дзейнасці вотчынных мануфактур на тэрыторыі Беларусі. Работа імкнецца асвятліць некаторыя з тэндэнцый. Цікавасць да асобы ў гісторыі прывяла да вывучэння выбітных дзеячоў вотчынных мануфактур – Ганны Радзівіл, Яна Маджарскага. Аўтар звяртае ўвагу чытача на важнае месца міждысцыплінарнага падыхода пры разглядзе праблемы, ілюструючы яго магчымасці праз мастацказнаўчы аналіз вырабаў вотчынных мануфактур. Таксама артыкул акрэслівае шэраг пытанняў гендернай гісторыі, якія закранаюцца падчас разгляду функцыянавання прыватнаўласніцкіх мануфактур.

***Ключавыя словы:*** тэндэнцыі і навацыі; вотчынныя мануфактуры; міждысцыплінарны падыход; гендерная гісторыя; асоба ў гісторыі.

# TRENDS AND INNOVATIONS IN THE STUDY OF THE ACTIVITIES OF PATRIMONIAL MANUFACTORIES ON THE TERRITORY OF BELARUS

**Y. V. Makouskaya**

*Belarusian State University, Nezavisimosti Av.,4, 220030, Minsk, Belarus, MakouskayaYV@bsu.by*

The 21st century brought significant innovations to the study of the problem of the activities of patrimonial manufactories on the territory of Belarus. The paper tries to shed light on some trends. Interest in personality in history led to the study of outstanding figures of patrimonial manufactories – Anna Radziwill, Jan Madzharsky. The author draws the reader's attention to the importance of an interdisciplinary approach when considering the problem, illustrating its possibilities through an artistic analysis of products from patrimonial manufactories. The article also identifies a number of gender history issues that are raised when examining the functioning of private manufactories.

***Keywords:*** trends and innovations; patrimonial manufactories; interdisciplinary approach; gender history; man in history.

У першай палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі пачынаюць распаўсюджвацца прадпрыемствы мануфактурнага тыпу. Першыя

мануфактуры на беларускіх землях належылі прадстаўнікам буйных магнацкіх радоў (Радзівілам, Сапегам, Храптовічам і інш.), таму атрымалі назву вотчынных ці прыватнаўласніцкіх. Такой тып мануфактурнага прадпрыемства функцыянаваў на нашых тэрыторыях ажно да сярэдзіны XIX стагоддзя, а з адменай прыгоннага права паступова знік. Дзейнасць вотчынных мануфактур аказала значны ўплыў не толькі на эканамічнае, але і на культурнае жыццё рэгіёну, пакінуўшы беларусам у спадчыну ўнікальнымі прыкладамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Перыяды гісторыі, звязаныя з істотнымі пераўтварэннямі ў грамадстве, заўсёды выклікалі цікавасць у даследчыкаў. XVIII – першая палова XIX стагоддзяў якраз адносіцца да такіх часоў. Гэта эпоха пачатку генезісу капіталістычных адносін на беларускіх землях, якія не маглі не садзейнічаць далейшым пераўтварэнням у іншых сферах жыцця. Значную ролю ў гэтых працэсах адыграла ўзнікненне прадпрыемств мануфактурнага тыпу.

Праблема ўзнікнення і функцыянавання вотчынных мануфактур стала цікавіць даследчыкаў яшчэ ў 50-60-ыя гады мінулага стагоддзя. Першае, і нажаль адзінае, грунтоўнае і ўсебаковае даследаванне, прысвечанае дзейнасці мануфактур, было праведзена М. Т. Раманоўскім і пабачыла свет у 1966 годзе ў выглядзе манаграфіі “Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии” [1]. Аўтар работы сабраў багаты фактalагічны матэрыял, манаграфія абапіраецца на вялікую колькасць як айчыннай, так і замежнай літаратуры. Мікалай Тарасавіч актыўна працаваў у Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці з фондам князёў Радзівілаў (зараз знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, ф. 694), дзякуючы чаму значная колькасць статыстычных дадзеных была вынайдзена, апрацавана і ўведзена ў навуковы абарот. Такім чынам удалося сфарміраваць грунтоўную фактaлагічную базу не толькі для даследавання Мікалая Тарасавіча, але і для наступных навукоўцаў, зацікаўленых у тэме. Праца “Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии” і зараз з’яўляецца пэўным эталонам у вывучэнні мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях.

Асноўны метад выкарыстаны М. Т. Раманоўскім – гісторыка-генетычны. Навуковец здолеў даць падрабязную характарыстыку кожнай мануфактуры паасобку ад заснавання прадпрыемства да іх скасавання, што дало магчымасць паспрабаваць уявіць агульны стан мануфактурнай прамысловасці рэгіёну. Аўтар апісвае ўсе прадпрыемствы па адной схеме. Спачатку распавядаецца пра час стварэння мануфактуры і месца яе размяшчэння. Потым аналізуецца знешні выгляд прадпрыемства. Тут даецца інфармацыя аб колькасці будынкаў і іх прызначэнні. Увага надаецца і

апісанню сітуацыі з працоўнай сілай. Манаграфія багатая на статыстычныя звесткі (паходжанне і колькасць майстроў, іх функцыянал і заробкі), а асаблівую каштоўнасць прадстаўляе выпрацаваная аўтарам схема кіравання, якая дзейнічала на вотчынных мануфактурах. Немалаважнае месца ў даследаванні займае пералік асартыменту мануфактур, звесткі аб памерах вытворчасці і поспехі ў рэалізацыі тавару. Аўтар спрабуе вызначыць час і прычыны знікнення мануфактур.

Фактычна, праца М. Т. Раманоўскага паказвае асноўную тэндэнцыю вывучэння вотчынных мануфактур у гэты перыяд. Самі вотчынныя мануфактуры як унікальная з’ява не былі цікавымі для даследчыкаў савецкіх часоў. Яны не задаваліся пытаннем: чаму развіццё мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях пайшло такім не стандартным шляхам? Галоўнае было паказаць этапы станаўлення капіталізму на тэрыторыі Беларусі, а ўзнікненне і развіццё мануфактур з’яўляецца адным з гэтых этапаў. Таму вотчынныя мануфактуры апісваюцца вельмі сціпла і толькі ў агульным кантэксце развіцця прадпрыемств мануфактурнага тыпу. Выкарыстанне сучаснымі даследчыкамі каштоўнаснага падыходу, які дае магчымасць засяродзіцца на ўнікальнасці, непаўторнасці прадмета даследавання, прывяло да трансфармацыі з’явы мануфактурнай прамысловасці ў прыватных уладаннях у асобны прадмет даследавання. У XXI стагоддзі выходзіць шэраг артыкулаў, прысвечаных вотчынным мануфактурам – Налібоцкай [2], Слуцкай [3] і г. д.

Для свайго часу манаграфія М. Т. Раманоўскага была інавацыйнай, адной з першых, хто ўвогулле закрануў тэму існавання вотчынных мануфактур. Разам з гэтым, кожны год з’яўляюцца новыя факты, даследаванні і ідэі, змяняюцца падыходы і метады разгляду пытанняў гісторыі. Грунтоўна да праблемы ўзнікнення і дзейнасці вотчынных мануфактур навукоўцы звярнуцца ўжо ў наступным, XXI стагоддзі, якое прынясе значныя навацыі ў вывучэнне гтага пытання.

XX стагоддзе – час значных асоб. М. Гандзі, А. Эйнштейн, М. Л. Кінг, Н. Мандела, М. Тэтчер, П. Пікаса, Б. Гейтс змянялі свет і пакінулі яскравы след у гісторыі. Менавіта ў гэты час становіцца важнай праблема месца асобы ў гісторыі. Навукоўцы задаюцца пытаннем: наколькі моцная сіла ўплыву асобы на гісторыю? Разважанні па праблеме находзяць выйсце ў навуковых працах (працы С. Хука, А. Тойнбі) і з’яўленні шматлікіх гістарычных даследаванняў, прысвечаных пэўнай гістарычнай асобе.

Нажаль, даследаванне М. Т. Раманоўскага выглядае безасабовым. Безумоўна, шэраг імёнаў фігуруе ў працы (заснавальнікі мануфактур,

выбітныя майстры), але яны губляюцца сярод шматлікіх фамілій навукоўцаў, на якіх аўтар шчодра спасылаецца. Гэтую лакуну імкнуцца закрыць сучасныя даследчыкі.

Гісторыя вотчынных мануфактур багатая на імёны выбітных людзей. Неверагодна, но факт, заснавальніца новага тыпу вытворчасці на беларускіх землях – жанчына. Першая вотчынная мануфактура ў мястэчку Налібакі была пабудавана па загадзе Ганны Катажыны Радзівіл. Тут выраблялі шкляны посуд спачатку для Радзівілаў, а потым і на продаж.

Дакладна зразумець, якім чынам жанчыне ў XVIII стагоддзі ўдалося адчыніць свой бізнес, можна толькі паглыбіўшыся ў яе біяграфію. Бацькі Ганны, тады яшчэ Сангушкі, былі адукаванымі людзьмі. Пры Гераніме і Канстанцыі Сангушках у іх радавым маёнтку Ракаве была адчынена і працавала друкарня, заснаваны дамініканскі кляштар і базыльянскі манастыр. Нажаль, хутка дзяўчына сталася сіратой і замест хатняга выхавання была вымушана атрымліваць адукацыю пры манастырах. Ганна навучалася ў вучэбна-выхаваўчай установе візітак у Варшаве. Іх праграма ахоплівала польскую і французскую мовы, Божы закон, спевы, музыку, шыццё – тыя дысцыпліны, якія будуць неабходныя жанчыне ў сямейным жыцці. Нельга скідваць з ліку тыя якасці характару, якія выхоўвала манастырская адукацыя, - працавітасць, цікавасць да чытання і ведаў, дысцыплінаванасць, акуратнасць. Навучанне дзяўчына прадоўжыла ў сясцёр-бенедыктынак, дзе праграмма ўключала паглыбленнае веданне французскай мовы, а таксама арыфметыкі.

Шчаслівым білетам для Ганны Катажыны стаў шлюб з Каралем Станіславам Радзівілам, прадстаўніком аднаго з багацейшых і вядомейшых радоў краіны, падканцлерам, а ў будучым і канцлерам Вялікага Княства Літоўскага. Яны шчасліва пражылі разам 27 год, да самай смерці Караля Станіслава. З 1719 года ўдава Радзівіл вымушана была змагацца не толькі з сямейнымі праблемамі, але і са справамі кіравання ардынацыяй, якія пакідалі жадаць лепшага. Ганна сутыкнулася з вялікімі запазычанасцямі мужа, да гэтага дадаліся спусташэнні і выдаткі Паўночнай вайны [4, 5]. Усе гэтыя складанасці падштурхнулі яе да не стандартнага рашэння пытання. У сваіх валадоннях Ганна Радзівіл заснавала спачатку адно, а потым і другое мануфактурнае прадпрыемства, што значна скараціла выдаткі дома Радзівілаў на шкляныя вырабы, а потым дало магчымасць неблагога заробку. Такі тып вытворчасці быў новым для тагачасных беларускіх зямель, мадам Радзівіл прывезла гэтую “навінку” са сваіх еўрапейскіх падарожжаў. Налібокская мануфактура па вытворчасці шкла была заснавана па ўзоры Дрэздэнскай каралеўскай мануфактуры, а першымі майстрамі сталі запрошаныя з-за мяжы спецыялісты (тагачасныя Баварыя, Сак-

сонія, Францыя, Чэхія). Мануфактуры, заснаваныя Ганнай Радзівіл, сталі добрым прыкладам для іншых беларускіх “прадпрымальнікаў” XVIII стагоддзя – Міхала і Гераніма Радзівілаў, графа Салагуба, Храптовіча, Сапегаў і шматлікіх іншых.

Гэтая неверагодная гісторыя дае магчымасць пашырыць веды па прадмеце, робіць даследаванне не толькі больш поўным, але больш жывым, што выгадна вылучае яго перад іншымі ў справе папулярызацыі гісторыі айчыннай эканомікі. Гісторыя вотчынных мануфактур багатая на выбітныя імёны, Ганна Катажына Радзівіл толькі адно з шматлікіх, што адчыняе шырокія даследчыцкія магчымасці для беларускіх навукоўцаў.

Міждысцыплінарнасць – актуальная рыса сучасных навуковых даследаванняў, якая можа быць дастасавана і да вывучэння пытання вотчынных мануфактур. Адной з самых карысных дысцыплін пры разглядзе гэтай праблемы аказалася мастацтвазнаўства. Яшчэ М. Т. Раманоўскі зазначыў высокіе мастацкіе якасці вырабляемай на мануфактурах прадукцыі: “Благодаря высокому художественному исполнению, во второй половине XVIII в. многие изделия Налибокского и Уречского стекольных заводов становятся предметом сбора для некоторых любителей-коллекционеров… Позднее эти изделия привлекли к себе внимание специалистов искусствоведов и приобретаются рядом музеев Польши…” [1, с. 53]. Ніякага аналізу, ці хаця бы вылучэння гэтай асаблівасці як характэрнай рысы вотчынных мануфактур на беларускіх землях у XVIII стагоддзі зроблена не было.

Першымі на ўнікальнасць і непаўторнасць вырабаў Налібоцкай, Урэцкай, Свержанскай, Слуцкай і іншых мануфактур звярнулі ўвагу менавіта мастацтвазнаўцы. У 1970–1980-ыя гады выходзяць працы М. М. Яніцкай, Д. С. Трызны [6, 7]. У працах М. М. Яніцкай [6] адлюстраваны асаблівасці працэсу вытворчасці ўрэцка-налібоцкага посуду, асноўныя формы і спосабы аздаблення шкляных мануфактурных вырабаў, выяўлены змены ў стандартах прыгажосці шкляных вырабаў. Заслугай аўтара з’яўляецца вылучэнне характэрных рыс для далейшай атрыбуцыі ўрэцка-налібоцкага посуду, папулярызацыя яго ўнікальнасці і непаўторнасці. Вялікі ўнёсак у вывучэнне такога беларускага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, як дывановае ткацтва, зрабіў Д. С. Трызна. У сваёй манаграфіі «Беларускія дываны і габелены» [7] аўтар дае даволі грунтоўную характарыстыку працэсу ткацтва дываноў, шпалер і габеленаў, акрэсліваючы асаблівасці, складанасці і характэрныя рысы гэтай вытворчасці. Праца ўтрымлівае ўнікальныя звесткі аб адным з самых вядомых узораў гэтага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – шпалерах, якія былі выраблены на Карэліцкай мануфактуры для Нясвіжскага палаца. Актыўныя раскопкі Мірскага замка

далі шматлікі матэрыял для даследавання фаянсавага посуду, які вырабляўся ў XVIII стагоддзі на Свержанскай мануфактуры. На падставе гэтага матэрыяла І. У. Ганецкая [8] дала даволі поўную характарыстыку дэкаратыўнага стылю свержанскага фаянса, акрэсліўшы яго асаблівасці. У XXI стагоддзі вывучэнне вырабаў вотчынных мануфактур з мастацказнаўчага боку прадаўжаецца. У 2015 годзе пабачыла свет грунтоўная і багатая на ілюстрацыі манаграфія Б. А. Лазукі, падсумаваўшая шматгадовае вывучэнне слуцкіх паясоў [9].

Разгляд вырабаў вотчынных мануфактур не праз лічбы прыходу і расходу, а з мастацказнаўчых пазіцый значна ўзбагачае даследаванне. Мануфактурная вытворчасць зрабіла значны ўнёсак не толькі ў развіццё эканамічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, але і ўзбагаціла культурную спадчыну рэгіёну. Урэцка-налібоцкае шкло, слуцкія паясы, свержанскі фаянс, карэліцкія шпалеры пакінулі значны адбітак не толькі ў культурным жыцці Беларусі і суседніх краін, але сталі заўважнай з’явай еўрапейскай і сусветнай культурнай спадчыны. Акрамя таго больш поўныя звесткі пра асартымент прадпрыемств, якасць і каштоўнасць вырабаў могуць паўплываць на высновы, зробленыя навукоўцамі па пытаннях шляхоў рэалізацыі тавараў, кліенцкай базы, эканамічнай магутнасці мануфактур і іх жыццяздольнасці ў тагачасных эканамічных умовах.

Яшчэ адным аспектам, які для пытання вотчынных мануфактур з’яўляецца слаба распрацаваным, але зараз набывае ўсё большую папулярнасць, з’яўляюцца гендерныя пытанні. Гендерная гісторыя разглядае даволі шырокае кола праблем, некаторыя з іх цікавы і для даследавання мануфактурных прадпрыемств.

Самым вядомым пытаннем ужо не адно дзесяцігоддзе з’яўляецца пытанне пра палавы склад працаўнікоў вотчынных прадпрыемств. Яшчэ Максім Багдановіч сваім вершам “Слуцкія ткачыхі” распачаў спрэчкі аб удзеле жанчын у вытворчасці слуцкіх паясоў. Архіўныя матэрыялы даюць падставу выказаць меркаванне аб выкарыстанні жаночай працы ў тых галінах вытворчасці, дзе яна была запатрабавана, – у большасці сваёй на тэкстыльных прадпрыемствах мануфактурнага тыпу. Дакладна вядома, што на Нясвіжскай тэкстыльнай мануфактуры на працу па вытворчасці нітак (прадзільшчыцамі) набіраліся мясцовыя маладыя жанчыны. Дакументы сведчаць, што прадзільшчыц на прадпрыемстве было каля 37 чалавек [10, с. 53-54], што складала не менш за 61 % ад агульнай колькасці працаўнікоў. Жанчыны дакладна працавалі і на слуцкай персіярні, яны таксама выконвалі працу прадзільшчыц, а яшчэ займаліся вырабам каштоўнай залатой і срэбнай ніткі [9, с. 138]. У іншай папулярнай галіне для вотчынных мануфактур XVIII стагоддзя – шкларобнай – імёны жанчын-працаўніц не сустракаюцца. Хутчэй за ўсё гэта звязана з кваліфікацыяй.

Жанчыны XVIII стагоддзя не мелі магчымасці атрымліваць адукацыю, авалодаць прафесіей для іх было нашмат складаней, чым мужчынам. Не дзіўна, што большасць кваліфікаванай працы была сканцэнтравана ў руках мужчын. Інфармацыя аб тым, што жанчыны з’яўляліся ўдзельніцамі вытворчага працэсу, падымае яшчэ шэраг пытанняў – ці ў аднолькавых умовах працавалі жанчыны і мужчыны? Ці адрознівалася аплата працы? Мелі жанчыны магчымасці для “кар’ернага” росту, ці іх статус на прадпрыемстве быў нязменны? На працягу дзесяцігоддзяў гісторыя прамысловасці ўтрымлівала выключна мужчынскія імёны, сучасныя даследчыкі маюць усе магчымасці ўзбагаціць яе і жаночымі (Ганна Катажына Радзівіл, Марыя Кулакоўская і інш.).

Падсумоўваючы, трэба зазначыць, што айчынная гістарычная навука не стаіць на месцы, з’яўляюцца новыя ідэі, падыходы і метады, якія дазваляюць разглядаць раней вывучаныя праблемы пад новымі вугламі. Тэма ўзнікнення і функцыянавання вотчынных мануфактур на беларускіх землях не з’яўляецца выключэннем. Да гэтай праблемы даследчыкі звярталіся пачынаючы з сярэдзіны мінулага стагоддзя. М. Т. Раманоўскі стварыў грунтоўны базіс, які з’яўляецца адпраўной кропкай і для сучасных даследчыкаў праблемы мануфактурнай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі. У XXI стагоддзі навукоўцы пашырылі даследчае поле тэмы. Зараз прадметам вывучэння сталі не толькі самі прадпрыемствы, але і людзі, якія там працавалі. Усе часцей з’яўляюцца артыкулы, ці цэлыя манаграфіі, прысвечаныя біяграфіям выбітных асоб, – Ганне Катажыне Радзівіл, Яну Маджарскаму і іншым. Знайшлося месца і для разгляду гендерных пытанняў у рамках тэмы. А міждысцыплінарны падыход дае магчымасць карыстацца метадамі і падыходамі іншых дысцыплін для ўзбагачэння даследавання. Так, значны ўнёсак у раскрыццё пытання даў мастацказнаўчы аналіз вырабаў вотчынных мануфактур XVIII стагоддзя. Артыкул утрымлівае толькі некаторыя прыклады новых ідэй, якімі скарысталіся навукоўцы пры разглядзе праблемы мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях. Тэма вотчынных мануфактур мае значны патэнцыял і чакае даследчыкаў, якія адкажуць на застаўшыеся пытанні.

## Библиографические ссылки

1. *Романовский Н. Т.* Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX ст.). Минск : Ротапринт НИ при Госплане БССР, 1966.

2. *Макоўская Я. У.* З гісторыі Налібоцкай мануфактуры // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. 2022. Вып. 21, ч. 1. С. 347–354.

3. *Ціткоўскі І.* Успамін пра слуцкую персіярню // Наследие слуцкого края : сайт. Весея, 2014. URL: https://nasledie-sluck.by/ru/sluchina/2819/4447/ (дата звароту:

14.09.2024.).
4. *Галубовіч В., Рыбчонак С., Шаланда А*. Чорная дама з Мірскага замка: княгіня Ганна Кацярына з Сангушкаў Радзівіл (1676–1746). Мір : Музей “Замкавы комплекс “Мір”, 2020.
5. *Масляніцына І., Багадзяж М.* Ганна Радзівіл: рамантычная гераіня – прадпрымальная магнатка // Женский журнал. 2008. № 3. С. 66-67.
6. *Яніцкая М. М.* Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVII стст.). Мінск : Навука і тэхніка, 1977.
7. *Трызна Д. С.* Беларускія дываны і габелены. Мінск : Навука і тэхніка, 1981.
8. *Ганецкая І. У.* Дэкаратыўны стыль фаянсу свержанскай мануфактуры. Мір, 2018.
9. *Лазука Б. А.* Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII стагоддзя. Малы лексікон. Мінск : Беларусь, 2015.
10. *Kula W.* Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku. Cz. 1 – 2: 1720 – 1780. Warszawa : Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, 1956.